*Масейчук Л.І.*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ДАКУМЕНТАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ НА ЗАНЯТКАХ ПА ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАХ У ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя.** У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі захоўваюцца ўнікальныя фонды, матэрыялы якіх можна і трэба выкарыстоўваць пры правядзенні заняткаў па беларускай гісторыі ў вышэйшых навучальных установах. Гэта праектная і справаводная дакументацыя, чарцяжы, фатаграфіі і інш. Асабліва актуальным будзе выкарыстанне такога кшталту дакументаў пры вывучэнні тэм, звязаных з гісторыяй індустрыялізацыі Беларусі, пасляваеннага аднаўлення усіх сфер народнай гаспадаркі, сучаснага этапа развіцця краіны.

Артыкул носіць аглядны характар і заклікаНы дапамагчы зарыентавацца выкладчыку пры падрыхтоўцы да лекцыйных і семінарскіх заняткаў па гісторыі.

*Ключавыя словы: дакумент, выкладчык, вышэйшая адукацыя, студэнт, гісторыя, архіў.*

**Masejchuk L.I.**

# APPLICATION OF DOCUMENTS OF THE BELARUSIAN ARCHIVE OF SCIENTIFIC AND TECHNICAL DOCUMENTATION IN HISTORICAL CLASSES IN HIGH SCHOOL

*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract**. The Belarusian archive of scientific and technical documentation contains unique funds, the materials of which can and should be used when conducting classes on Belarusian history in higher educational institutions. These are design and management documentation, drawings, orders, photos. The use of such documents will be especially relevant when studying topics related to the industrialization of Belarus, the post-war recovery of all spheres of the national economy, and the current stage of the country's development.

The article is of an overview nature and is intended to help the teacher orientate himself when preparing for lectures and seminars on history.

*Keywords: document, teacher, higher education, student, history, archive.*

Гістарычны дакумент з’яўляецца адным з асноўных сродкаў навучання гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь. Менавіта гэты сродак вывучэння гістарычных фактаў можа даць дастаткова дакладнае разуменне таго, што адбывалася ў тую ці іншую эпоху.

Асноўнай крыніцай нашых ведаў аб мінулым з'яўляецца дакумент. Навуковец будуе сваю працу на вывучэнні дакументаў эпохі. Значная частка

навуковых прац нараджаецца ў выніку ўважлівага вывучэння першакрыніц. Вывучэнне дакументаў эпохі патрабуе ведання спецыфічных метадаў расшыфроўкі, аналізу і інтэрпрэтацыі крыніц.

Важнейшым у працэсе навучання студэнтаў з'яўляецца прынцып нагляднасці, дзякуючы якому фарміруюцца вобразныя ўяўленні і паняцці аб гістарычным мінулым. Яшчэ ў XVII стагодзі Я. А. Каменскі сфармуляваў і ўабгрунтаваў прынцып навучання: *«...все, что только можно представлять для восприятия чувствами, а именно: видимое – для восприятия зрением, слышимое – слухом, запахи – обонянием, подлежащее вкусу – вкусом, доступное осязанию – путем осязания. Если какие-либо предметы сразу можно воспринять несколькими чувствами, пусть они сразу схватываются несколькими чувствами»*. Гэты прынцып актуальны і ў наш час пры выкладанні гістарычных дысцыплін у вышэйшай школе Беларусі.

У Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі (далей – БДАНТД) захоўваюцца ўнікальныя фонды, матэрыялы якіх можна і трэба выкарыстоўваць пры правядзенні заняткаў па гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў вышэйшай школе Беларусі: праектная і справаводная дакументацыя, чарцяжы, фатаграфіі і інш.

Асабліва актуальным будзе выкарыстанне такога кшталту дакументаў пры вывучэнні тэм, звязаных з гісторыяй індустрыялізацыі Беларусі ў 1930-я гг., пасляваеннага аднаўлення гарадоў, прамысловасці, медыцынскай і сацыяльнай сфер (1945–1960), сучаснага этапа развіцця рэспублікі і інш.

Так, напрыклад, гісторыю пасляваеннага аднаўлення сістэмы аховы здароўя БССР дазваляюць прасачыць дакументы фонда № 14 «Праектна-канструктарскае бюро Міністэрства аховы здароўя БССР». Бюро было створана ў 1944 г. і займалася распрацоўкай праектнай дакументацыі на аб'екты аховы здароўя, жылыя дамы для медыцынскіх работнікаў і на заводы медыцынскіх прэпаратаў. Архітэктары А. І. Чыжык, М. С. Саўчык, А. Рохліс фактычна з руін аднавілі Інстытут фізіятэрапіі ў г. Мінску (праект 1945 г ) [1], галоўны і навучальны карпусы Медыцынскага інстытута ў г. Мінску (праект 1947 г. ) [2], Мікрабіялагічны інстытут у г. Мінску (праект 1948 г) [3], псіхіятрычную бальніцу ў г. Магілёве (праект 1949 г.) [4].

Найбольш інфарматыўнымі ў плане вывучэння гісторыі пасляваеннай рэканструкцыі беларускіх гарадоў з'яўляюцца дакументы асабістых фондаў народных архітэктараў СССР Г. У. Заборскага (Ф. 113) і У. А. Караля (Ф. 51), заслужаных архітэктараў БССР Г. А. Парсаданава (Ф. 111), В. М. Волчака (Ф. 81), Г. У. Сысоева (Ф. 127), вядомых архітэктараў І. Р. Лангбарда (Ф. 25), М. І. Бакланава (Ф. 128), В. І. Гусева (Ф. 98), Р. М. Алімава (Ф. 86), М. З. Барсукова (Ф. 88) , Н. Е Трахтэнберга (Ф. 75), М. І. Томаха (Ф. 212), Л. Д. Усавай (Ф. 276), Н. М. Макляцовай (Ф. 77), С. С. Мусінскага (Ф. 290) і інш.

Пры падрыхтоўцы заняткаў па гісторыі развіцця Беларусі ў даваенны перыяд можна шырока выкарыстоўваць дакументы з асабістага фонда № 25 Іосіфа Рыгоравіча Лангбарда (1882-1951).

Па праектах Іосіфа Лангбарда ў Беларусі былі пабудаваны: у г. Мінску – Дом урада БССР [6, спр. 4], Дом Чырвонай Арміі (сучасны Дом афіцэраў) (1934–1939) [6, спр. 11], Беларускі тэатр оперы і балета (1934–1937) [6, спр. 91-107], галоўны корпус Акадэміі навук БССР (1935–1940) [6, спр. 75–90], Дом Саветаў у г. Магілёве (1938–1939) [6, спр. 117-118]. У гэты ж час архітэктарам былі распрацаваны два праекты відовішчных збудаванняў: комплекса тэатра і кіно для Оршы (1930 г.) [5, спр. 122] і абласнога драматычнага тэатра ў г. Магілёве (1939 г.).

З даваенных пабудоў па праектах Іосіфа Рыгоравіча да нашых дзён захаваліся: Тэатр оперы і балета, Дом афіцэраў, галоўны корпус Акадэміі навук БССР, у г. Магілёве Дом саветаў. Будынкі прызнаны помнікамі архітэктуры канструктывізму 30-х гг. ХХ стагоддзя.

Безумоўна, уключэнне кароткага апавядання аб даваенным будаўніцтве, якое суправаджаецца наглядным матэрыялам, будзе садзейнічаць развіццю эмацыйна-маральнага і духоўнага выхавання студэнтаў.

Творчы і прафесійны лёс такіх архітэктараў як М. І. Бакланаў [7], Г. У. Заборскі [8], В. М. Волчак [9], Я. К. Дзятлаў [10], Г. У. Сысоеў [11], У. А. Кароль [12], Г. А. Парсаданаў [13] звязана з гісторыяй Беларусі. У чэрвені 1941 г. яны добраахвотнікамі пайшлі на фронт. Ваенны лёс кідаў будучых дзеячаў беларускай архітэктуры ў самыя жорны актыўнага супраціву нямецка-фашысцкім захопнікам. Яны ваявалі, але ніхто з іх не забываўся пра творчае прызначэнне і не выпускаў з рук аловак, пакінуўшы тым самым для нашчадкаў унікальныя сведчанні паўсядзённасці ваеннага часу.

Выкарыстанне матэрыялаў з іх асабістых фондаў, такіх як эскізы і малюнкі, інтэрв'ю, конкурсныя і архітэктурныя праекты, фатаграфіі будаўнічых работ, працоўных сустрэч і афіцыйных візітаў зробіць занятак больш інфарматыўным і запамінальным, дазволіць больш глыбока раскрыць вывучаемую тэму, асвятліць яе праз прызму ўспрымання чалавека - ўдзельніка падзеі.

Асаблівую цікавасць, на наш погляд, прадстаўляюць матэрыялы фонда №3 «Арэнднае прадпрыемства «Інстытут «Белпраект» БГАНТД. Сярод мноства дакументаў у фондзе захоўваюцца генеральныя планы гарадоў БССР: Мінска (1946, 1959 гг.), Брэста (1953, 1964 гг.), Віцебска (1948 г.), Гродна (1948, 1963 гг.), Магілёва (1934, 193) 1948, 1961 гг.); тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне аднаўлення, рэканструкцыі і развіцця гарадоў і населеных пунктаў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны, праекты планіровак і іх забудоў. Рабочыя праекты Дома ўрада, Акадэміі навук БССР, галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага політэхнічнага інстытута, Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, кінатэатраў «Перамога», «Кастрычнік», Мінскага цырка, Дамоў культуры трактарнага завода і камвольнага камбіната, Галоўнага паштамта, Цэнтральнага тэлеграфа, гасцініц «Беларусь», «Юбілейная», «Планета» ў г. Мінску, маладзёжнай базы-гасцініцы на Заслаўскім вадасховішчы і іншыя дакументы, уключаныя ў практычныя заняткі, дазволяць больш поўна асвятліць тэму пасляваеннага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Практычна адначасова з заканчэннем Вялікай Айчыннай вайны пачаліся работы па добраўпарадкаванні магіл, распрацоўцы да іх надмагілляў,

праектаванне і ўзвядзенне помнікаў і мемарыяльных комплексаў. Пастанова Савета Міністраў БССР і ЦК(б)Б № 827–333/7 ад 14 мая 1946 г. абавязвала добраўпарадкаваць магілы савецкіх воінаў, падпольшчыкаў і партызан, якія загінулі ў гады вайны і на іх месцы ўзвесьці помнікі [14].

У БГАНТД на захоўванні ёсць фонд № 68 «Грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз архітэктараў», якое зрабіла значны ўклад у працэс мемарыяльнага будаўніцтва. Сярод матэрыялаў фонда захоўваюцца конкурсныя праекты «Манумент Перамогі ў г. Мінску», «Мемарыяльныя могілкі па вул. Талбухіна ў г. Мінску», мемарыяльныя комплексы ў г.п. Расоны Віцебскай вобласці, «Брэсцкая крэпасць-герой», «Кацюша» ў г. Оршы і інш. Выкарыстанне дакументаў фонда будзе карысным пры правядзенні семінарскіх заняткаў па тэме «Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларусаў».

Такім чынам, пры правядзенні заняткаў па гісторыі Беларусі ў вышэйшай школе выкладчык, для візуалізацыі выкладаемага матэрыялу, можа выкарыстоўваць такія дакументы як праектная і справаводная дакументацыя, чарцяжы і фатаграфіі. Усё гэта актывізуе працэс мыслення і ўяўленні ў навучэнцаў, спрыяе больш плённаму засваенню гістарычных ведаў і развіццю гістарычнай свядомасці.

**Литература**

1. Ян Амос Коменский: кратко о педагогической концепции [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://bsa.by/news/BUA/pervyie-pamyatniki-pavshim-geroyam - Дата доступа: 29.02.2024.
2. Беларускі дзяржаўны архіў навукова тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД). Фонд 14. Воп. 1. Спр. 2.
3. БДАНТД. Фонд 14. Воп. 1. Спр. 12.
4. БДАНТД. Фонд 14. Воп. 1. Спр. 4.
5. БДАНТД. Фонд 14. Воп. 1. Спр. 64.
6. БДАНТД. Фонд 25. Воп. 1.
7. БДАНТД. Фонд 25. Воп. 2.
8. БДАНТД. Фонд 128.
9. БДАНТД. Фонд 113.
10. БДАНТД. Фонд 81.
11. БДАНТД. Фонд 158. Воп. 1.
12. БДАНТД. Фонд 127.
13. БДАНТД. Фонд 51. Воп. 1.
14. БДАНТД. Фонд 111.
15. Сергачев, С. Первые памятники павшим героям / С. Сергачев [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://bsa.by/news/BUA/pervyie-pamyatniki-pavshim-geroyam - Дата доступа: 16.02.2024.